## Прывітаньне ЦВК БССР

У дзень дзесяцігадовага юбілею фізкультурнага руху Беларусі прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР перадае фізкультурнікам, закліканым выкаваць усебакова фізычна разьвітыя, марксыцка-ленінска выхаваныя, загартаваныя для працы і клясавай барацьбы найшырэйшыя пласты працоўных мас,—бальшавіцкае прывітаньне.

Далейшай задачай фізкультурных арганізацый павінна зьявіцца неаслабная барацьба за якасьць сваёй работы, за ўзмацненьне фізычнага выхаваньня шырокіх мас працоўных, больш паглыбленую, высокую па якасьці перабудову сваіх радоў на аснове комплексу „Гатоў да працы і абароны“, дабіваючыся ахопу выпрабаваньнем на значок шырокіх пластоў працоўных; множыць посьпехі на фізкультурным вучастку агульнага фронту соцыялістычнага будаўніцтва, за пабудову бясклясавага соцыялістычнага грамадзтва.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы